# *§ 54–0. Расійская Федэрацыя

**З'ЕЗД НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ**
**СНД ДЗЯРЖАЎНАЯ ДУМА**
**САВЕТ ФЕДЭРАЦЫІ ДКНС**
**«ШОКАВАЯ ТЭРАПІЯ»**
**ПЕРАБУДОВА РЭФЕРЭНДУМ**

**1. Распад СССР.** Перабудова, што пачалася спробай палепшыць эканамічныя паказчыкі, прывяла да рэзкага падзення вытворчасці і пагаршэння ўмоў жыцця большасці савецкіх людзей. Кіраўніцтву краіны рабілася зразумела, што без змен у палітычнай сферы немагчымае вырашэнне эканамічных праблем.

Успомніце, што такое перабудова. У чым яна заключалася?

Улетку 1988 г. з ініцыятывы партыйнага кіраўніцтва ў СССР пачалася палітычная рэформа.

**Палітычная рэформа 1988 г.**

| Першы этап рэформы | Другі этап рэформы |
|---|---|
| *Аднаўленне паўнаўладдзя Саветаў.*<br>Была адноўлена (на ўзор Канстытуцыі 1918 г.) двухузроўневая сістэма прадстаўнічых органаў:<br>1) З'езд народных дэпутатаў СССР — вышэйшы заканадаўчы орган улады;<br>2) Вярхоўны Савет (абіраўся шляхам тайнага галасавання з дэпутатаў З'езда) — пастаянна дзеючы «парламент».<br>З'езд пачаў сваю працу 25 мая 1989 г. Старшынёй Вярхоўнага Савета СССР быў абраны М. С. Гарбачоў | *Стварэнне новых структур органаў улады на месцах* — у рэспубліках, краях, абласцях, гарадах.<br>Вясной 1990 г. быў сфарміраваны склад I З'езда народных дэпутатаў РСФСР, на якім 12 чэрвеня 1990 г. была прынятая Дэкларацыя аб суверэнітэце РСФСР |

**Прэзідэнт СССР**

У 1990 г. у СССР быў уведзены інстытут прэзідэнцтва. Кіраўнік дзяржавы абіраўся не прамым галасаваннем насельніцтва, а на пасяджэнні З'езда народных дэпутатаў. На III пазачарговым З'ездзе народных дэпутатаў прэзідэнтам СССР быў абраны М. С. Гарбачоў.

Паводле задумы ініцыятараў палітычнай рэформы інстытут прэзідэнцтва заклікаены быў стабілізаваць сітуацыю ў грамадстве. Ва ўмовах, калі пачыналася фарміраванне шматпартыйнасці, прэзідэнт меў стаць вышэй за ўсіх канкурэнтаў у барацьбе за ўладу і адначасова з гэтым забяспечыць роўнасць усіх перад законам. Аднак у выніку сітуацыя толькі ўскладнілася: новы інстытут прэзідэнцтва не сумяшчаўся з захаваннем уплыву Саветаў.



БЮЛЛЕТЕНЬ

для голосования на референдуме СССР

17 марта 1991 года

Считаете ли Вы необходимым сохранение Союза Советских Социалистических Республик как обновленной федерации равноправных суверенных республик, в которой будут в полной мере гарантироваться права и свободы человека любой национальности.

Оставьте один из указанных ответов, другой вычеркните

ДА НЕТ

Бюллетень в котором при голосовании вычеркнуты слова ДА и НЕТ или не вычеркнуты оба слова, признается недействительным.

17 сакавіка 1991 г. у рэспубліках СССР адбыўся рэферэндум наконт пытання захавання Саюза. На рэферэндуме больш чым 76 % яго ўдзельнікаў выказаліся за захаванне СССР.

Да сярэдзіны 1991 г. у большасці рэспублік СССР ужо былі прынятыя дэкларацыі або законы аб суверэнітэце. На 20 жніўня 1991 г. было прызначана падпісанне новай саюзнай дамовы.

**ДКНС**

Аднак частка кіраўніцтва СССР на чале з віцэ-прэзідэнтам Г. І. Янаевым паспрабавалі сарваць падпісанне новай дамовы і аднавіць СССР у ранейшым выглядзе. М. С. Гарбачоў быў ізаляваны ў крымскай рэзідэнцыі — Форасе, а ў Маскве 19 жніўня 1991 г. быў створаны *Дзяржаўны камітэт па надзвычай-*

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

На праведзеным 17 сакавіка 1991 г. рэферэндуме з 147 млн грамадзян, якія прынялі ў ім удзел, 112 млн выказаліся за захаванне Саюза як абноўленай Федэрацыі раўнапраўных суверэнных рэспублік, у якой у поўнай меры будуць гарантаваныя правы і свабоды чалавека любой нацыянальнасці..

1. *Колькі працэнтаў грамадзян, якія ўдзельнічалі ў рэферэндуме, прагаласавалі за захаванне Савецкай дзяржавы?*
2. *З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся колькасць насельніцтва СССР у 1991 г. Які працэнт з іх прыняў удзел у галасаванні?*
3. *У якіх саюзных рэспубліках рэферэндум не праводзіўся?*
4. *Падумайце, чаму ўдзельнікі рэферэндуму галасавалі «за» ці «супраць» захавання СССР.*

*ным становішчы (ДКНС)*. У задушэнні гэтага выступлення вялікую ролю адыграў Прэзідэнт Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР) Б. М. Ельцын, чыя пазіцыя пазней паскорыла распад СССР.

**8 снежня 1991 г.** лідары трох усходнеславянскіх дзяржаў — Расіі, Беларусі і Украіны — на сустрэчы ў Віскулях (Белавежская пушча), насуперак вынікам рэферэндуму 17 сакавіка 1991 г., абвясцілі пра дэнансацыю (разрыў) Дамовы аб утварэнні СССР і стварэнні СНД. На сустрэчы ў Алма-Аце **21 снежня 1991 г.** лідары 11 былых саюзных рэспублік падпісалі Дэкларацыю аб утварэнні СНД. 25 снежня 1991 г. М. С. Гарбачоў падаў у адстаўку з пасады Прэзідэнта СССР — дзяржавы, якой фактычна ўжо не існавала.

Распад Савецкага Саюза меў глыбокія наступствы і для постсавецкай прасторы, і для ўсяго свету. Гэтая

### Стварэнне СНД

Пакажыце на карце дзяржавы, якія падпісалі Дэкларацыю аб утварэнні СНД.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

**Перадумовы распаду Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік**

| Эканамічныя | Палітычныя | Нацыянальныя |
|---|---|---|
| • скарачэнне вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы;<br>• інфляцыя, абясцэньванне рубля;<br>• дэфіцыт тавараў шырокага спажывання;<br>• няўдачы эканамічных рэформаў і падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва;<br>• сусветны абвал цэн на нафту | • аслабленне ўплыву КПСС, масавы выхад з партыі;<br>• незбалансаванасць паўнамоцтваў цэнтра і рэспублік;<br>• барацьба за ўладу паміж цэнтральнымі і нацыянальна-рэгіянальнымі палітычнымі элітамі | • праявы нацыянальнага сепаратызму і рэгіянальнага эканамічнага ізаляцыянізму, актывізацыя нацыянальных рухаў;<br>• міжнацыянальныя канфлікты (Карабах, Прыднястроўе, Закаўказзе, Сярэдняя Азія) |

*1. Выявіце прычынна-выніковыя сувязі паміж паказанымі ў схеме з'явамі і працэсамі і распадам СССР.*

*2. Успомніце знешнепалітычныя фактары распаду Савецкага Саюза.*

Успомніце геапалітычныя наступствы распаду СССР.

падзея негатыўна паўплывала на эканамічнае і палітычнае развіццё былых савецкіх рэспублік, прывяла да эканамічнага крызісу, які шмат у чым быў абумоўлены разрывам эканамічных сувязей, абвастрэння міжнацыянальных канфліктаў на постсавецкай прасторы.

Даведайцеся, што значыла для Расіі выступіць «правапераемніцай СССР».

**2. Дзяржаўна-палітычнае развіццё Расійскай Федэрацыі.** 25 снежня 1991 г. РСФСР афіцыйна пачала называцца Расійскай Федэрацыяй (РФ). Найбуйнейшая саюзная рэспубліка выступіла правапераемніцай СССР.

**Палітычны крызіс 1990-х гг.**

Напачатку 1990-х гг. у РФ сфарміравалася апазіцыя палітыцы Урада і Прэзідэнта РФ. Паводле свайго складу яна была неаднародная — ад прыхільнікаў адраджэння сацыялістычнага ладу і ўзнаўлення СССР да манархістаў, але ўсіх іх аб'ядноўвала негатыўнае стаўленне да палітыкі *перабудовы*, яе вынікаў і рэформаў, якія праводзіліся.

Апазіцыя Ураду і Прэзідэнту РФ карысталася значным уплывам у вышэйшых заканадаўчых органах краіны. Рашэнні, якія прымаў Урад, блакаваліся ў Вярхоўным Савеце. У снежні 1992 г. VII З'езд народных дэпутатаў РФ унёс папраўкі ў Канстытуцыю, якія абмяжоўвалі ўладу Прэзідэнта і Урада. Апазіцыйныя сілы пачалі патрабаваць адстаўкі Прэзідэнта РФ. Ва ўмовах нарастання супрацьстаяння заканадаўчай і выканаўчай галін улады Б. М. Ельцын вынес пытанне даверу Прэзідэнту на ўсенародны рэферэндум (красавік 1993 г.). Пасля яго быў падрыхтаваны праект новай Канстытуцыі, у якой значна пашыраліся паўнамоцтвы Прэзідэнта.

**Вынікі рэферэндуму ў красавіку 1993 г.**

- Удзельнічала больш за 50 % выбаршчыкаў;
- выказаліся «за» давер Прэзідэнту РФ 58,7 %;
- падтрымалі сацыяльна-эканамічную палітыку Прэзідэнта РФ 53 %

Пра што сведчылі вынікі рэферэндуму?

У верасні — пачатку кастрычніка 1993 г. супрацьстаянне галін улады ў Расіі набыло найбольш востры характар. 2–3 кастрычніка 1993 г. у Маскве адбыліся ўзброеныя сутыкненні. 4 кастрычніка верныя Прэзідэнту і Ураду войскі захапілі Белы дом (Дом Саветаў РФ), які абаранялі дэпутаты Вярхоўна-

| Па Канстытуцыі РФ 1993 г. | | |
|---|---|---|
| **Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі** | **Федэральны сход Расійскай Федэрацыі** — двухпалатны Парламент. Прадстаўнічы і заканадаўчы орган РФ | |
| Фарміруе Урад, выступае гарантам выканання Канстытуцыі, Вярхоўным галоўнакамандуючым, вызначае асноўныя кірункі знешняй палітыкі, мае права распускаць парламент і прызначаць датэрміновыя выбары, карыстаецца заканадаўчай ініцыятывай | **Верхняя палата** — *Савет Федэрацыі* — фарміруецца з прадстаўнікоў заканадаўчай і выканаўчай улады асобных суб'ектаў Расійскай Федэрацыі | **Ніжняя палата** — *Дзяржаўная дума* — абіраецца грамадзянамі з ліку кандыдатаў, вылучаных палітычнымі партыямі, і па аднамандатных акругах (50 % месцаў) |

га Савета. Выбары ў вышэйшы заканадаўчы орган і адначасова рэферэндум наконт прэзідэнцкага праекта Канстытуцыі адбыліся 12 снежня 1993 г. 58,4 % удзельнікаў усенароднага галасавання падтрымалі новую *Канстытуцыю Расійскай Федэрацыі*, у якой былі вызначаны асноўныя прынцыпы грамадска-палітычнага ладу краіны, структура органаў улады і кіравання.

**Прыняцце новай Канстытуцыі РФ. 1993 г.**

Паводле вынікаў агульнарасійскага галасавання 1 ліпеня 2020 г. у Канстытуцыю Расійскай Федэрацыі былі ўнесены змены, якія прадугледжвалі ўзмацненне ролі Прэзідэнта шляхам істотнага пашырэння яго паўнамоцтваў, умацаванне пазіцый Савета Федэрацыі і Дзяржаўнай думы, у тым ліку за кошт надзялення іх членаў дадатковай кампетэнцыяй, пашырэнне паўнамоцтваў Урада, кампетэнцыі Канстытуцыйнага Суда і органаў мясцовага самакіравання, недапушчэнне выканання міжнародна-прававых актаў, якія супярэчаць Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі.

**Урэгуляванне адносін цэнтра і суб'ектаў Федэрацыі**

Яшчэ адна праблема, з якой сутыкнулася расійскае кіраўніцтва ў першыя гады незалежнага існавання, была звязаная з урэгуляваннем адносін

цэнтра і асобных суб’ектаў Федэрацыі. 31 сакавіка 1992 г. у Маскве была падпісаная Федэратыўная дамова, у адпаведнасці з якой значна пашырыліся паўнамоцтвы органаў улады аўтаномных рэспублік у складзе РФ. Але нават такую дамову не падпісалі Татарстан і Чачня. Некаторыя рэспублікі прынялі ўласныя канстытуцыі, якія сцвярджалі вяршэнства мясцовых законаў.

Надзвычай цяжкая сітуацыя склалася ў Чачэнскай рэспубліцы, кіраўніцтва якой зрабіла стаўку на ўзброенае вырашэнне праблемы ўзаемаадносін з цэнтрам. У снежні 1994 — жніўні 1996 г. федэральныя войскі правялі першую аперацыю па аднаўленні канстытуцыйнага парадку ў Чачні, а ў жніўні 1999 — красавіку 2000 г. — другую чачэнскую (контртэрарыстычную) аперацыю (асобныя мерапрыемствы па барацьбе з бандфарміраваннямі працягваліся да 2009 г.).

Паступова адносіны з суб’ектамі Федэрацыі былі нармалізаваныя.

Прэзідэнт РФ — У. У. Пуцін

У 1996 г. на чарговы тэрмін Прэзідэнтам РФ быў пераабраны Б. М. Ельцын, але 31 снежня 1999 г. ён добраахвотна пакінуў сваю пасаду. Выконваючым абавязкі Прэзідэнта РФ стаў Кіраўнік Урада У. У. Пуцін. На выбарах, якія адбыліся 26 сакавіка 2000 г., ён атрымаў пераканаўчую перамогу ў першым туры.

Стабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў краіне паспрыяла ўмацаванне пазіцый улады ў парламенце. На выбарах у Дзяржаўную думу ў 1999 г. большасць галасоў атрымалі рух «Адзінства» (лідар — С. К. Шайгу), члены якога выступалі пад лозунгам працягу рэформаў, і партыя «Айчына — Уся Расія» (лідары — Я. М. Прымакоў і Ю. М. Лужкоў). У 2001 г. адбылося аб’яднанне праўрадавых сіл у адну партыю «Адзіная Расія». Падтрымка ўстойлівай большасці ў парламенце дазволіла У. У. Пуціну правесці ў жыццё рашэнні, якія адпавядалі інтарэсам усіх пластоў насельніцтва.

Паспяховаму вырашэнню задач, што сталі перад Расійскай Федэрацыяй, спрыялі рэформы ў галіне дзяржаўнага і мясцовага кіравання, якія мелі мэтай умацаванне вертыкалі ўлады: падзел краіны на 7 федэральных акруг на чале з паўнамоцнымі прадстаўнікамі Прэзідэнта; змяненне сістэмы фарміравання Савета Федэрацыі і выбараў мэраў і губернатараў; жорсткі кантроль Адміністрацыі Прэзідэнта за іх дзейнасцю; стварэнне новага кансультацыйнага органа — Дзяржаўнага Савета РФ, які фарміруецца з кіраўнікоў рэгіёнаў.

**3. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў Расійскай Федэрацыі.** Распад СССР і сусветнай сацыялістычнай сістэмы прывёў да з’яўлення мноства праблем у эканоміцы і сацыяльнай сферы. Парушыліся эканамічныя сувязі з былымі саюзнымі рэспублікамі і краінамі, што ўваходзілі ў СЭУ. Ініцыятывы па раззбраенні і скарачэнні фінансавання ваенна-прамысловага комплексу, вельмі пазітыўна ўспрынятыя ў краінах Захаду, адначасова вялі да беспрацоўя.

Успомніце, што такое СЭУ. Калі ён быў створаны? Якія краіны ў яго ўваходзілі?

Расія, зрабіўшыся правапераемніцай СССР, узяла на сябе абавязацельствы выплаціць пазыкі былога Савецкага Саюза (каля 70 млрд долараў).

З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, калі Расія выплаціла ўсе пазыкі СССР. Што такое «нулявы варыянт»?

У новым урадзе РФ, сфарміраваным у 1992 г., ключавыя пасады занялі прыхільнікі рэформаў на чале з выконваючым абавязкі прэм’ер-міністра Я. Ц. Гайдарам. Прапанаваны імі шлях выхаду з крызісу, галоўным зместам якога быў хуткі пераход да рыначнай эканомікі, пачалі называць *«шокавай тэрапіяй»*.

«Шокавая тэрапія»

**«ШОКАВАЯ ТЭРАПІЯ»**

- лібералізацыя цэн — адмова ад дзяржаўнага рэгулявання цэн на большую частку тавараў;
- зняцце абмежаванняў на прыватнапрадпрымальніцкую дзейнасць, у тым ліку ў галіне гандлю;
- правядзенне прыватызацыі — пераводу дзяржаўнай уласнасці ў рукі працоўных калектываў і прыватных асоб;
- фінансавая стабілізацыя

**Станоўчыя вынікі «шокавай тэрапіі»**

- на ўнутраным рынку атрымалася збалансаваць попыт і прапанову, была вырашаная праблема таварнага дэфіцыту, ліквідаваная пагроза голаду, якая ўзнікла ў некаторых раёнах краіны ў 1989–1991 гг.;
- прыватызацыя прывяла да абуджэння гаспадарчай ініцыятывы, часткова паспрыяла вырашэнню праблемы беспрацоўя

**Негатыўныя наступствы «шокавай тэрапіі»**

- лібералізацыя цэн пры дэфіцыце тавараў прывяла да значнага іх росту;
- уцечка капіталаў за мяжу, куды вывозіліся дэфіцытныя матэрыялы, сыравіна і тавары;
- колькасць беспрацоўных на 1997 г. дасягнула 7 млн чалавек;
- не дала меркаваных вынікаў прыватызацыя, квітнела «ценявая» эканоміка, звязаная з крымінальнымі структурамі;
- да крытычнага ўзроўню скарацілася фінансаванне навуковых даследаванняў і сферы адукацыі;
- 17 жніўня 1998 г. Урад быў вымушаны заявіць аб дэфолце — адмове ад абавязацельстваў пагашэння знешніх і ўнутраных даўгоў краіны. Адбылася дэвальвацыя (абясцэньванне) рубля ў адносінах да замежных валют

Як вы лічыце, вынікі палітыкі «шокавай тэрапіі» ў РФ — гэта заканамерныя наступствы такой эканамічнай палітыкі ці збег выпадковых фактараў?

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ



*Президент Российской Федерации В. В. Путин*

**Рэформы У. У. Пуціна**

- Падатковая рэформа: увядзенне адзінага 13 %-га падаходнага падатку;
- пенсійная рэформа: пераход на назапашвальны прынцып фарміравання пенсіі;
- рэформа банкаўскай сферы: узмацненне кантролю над ліцэнзаваннем камерцыйных банкаў;
- рэформа жыллёва-камунальнай гаспадаркі: сыход дзяржавы са сферы камунальных паслуг;
- ільготная рэформа: перавод часткі льгот у грашовы эквівалент;
- рэалізацыя нацыянальных праектаў «Здароўе», «Адукацыя», «Даступнае жыллё», «Развіццё аграпрамысловага комплексу».

Па выніках прэзідэнцкіх выбараў за У. У. Пуціна прагаласавалі: 2004 г. — 71,3 % выбаршчыкаў; 2012 г. — 63,6 %; 2018 г. — 76,7 %; 2024 г. — 83,7 %.

1. *Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, канкрэтызуйце рэформы, праведзеныя ў гады прэзідэнцтва У. У. Пуціна, гістарычнымі фактамі.*
2. *Якім чынам гэтыя рэформы маглі паспрыяць стабілізацыі сітуацыі ў РФ, ажыўленню эканомікі?*
3. *Пра што сведчаць прыведзеныя вынікі выбараў Прэзідэнта РФ?*

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Эканоміка РФ у апошнія дзесяцігоддзі аказалася пад уздзеяннем трох фактараў.

1. *Міжнародны эканамічны крызіс 2008 г.* Удалося пераадолець дастаткова хутка. Асабліва заўважным было ажыўленне ў аграрным сектары. Напачатку 2020-х гг. Расія заняла лідзіруючыя пазіцыі ў свеце па экспарце збожжа.

2. *Санкцыйны ціск краін Захаду ад 2014 г.* Санкцыі не толькі не прывялі да меркаванага краху эканомікі Расіі, але і паспрыялі яе актывізацыі і суверэнізацыі. Пазітыўныя вынікі даў курс на імпартазамяшчэнне.

3. *Пандэмія каранавіруса 2020 г.* Эканамічны спад, звязаны з пандэміяй, быў пераадолены ўсяго за год.

*Створаная ў 2015 г. нацыянальная плацежная сістэма «Мір» — сімвал імпартазамяшчэння*

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі:*

*1. Канкрэтызуйце гістарычнымі фактамі ўплыў названых фактараў на эканоміку РФ і захады, якія былі зроблены расійскім Урадам для змяншэння іх негатыўнага ўздзеяння.*

*2. Знайдзіце вызначэнне тэрміна «імпартазамяшчэнне». Якую ролю яно адыгрывае ў эканамічным развіцці сучасных дзяржаў?*

У 2000 г. рэальныя даходы расійскіх грамадзян у параўнанні з 1991 г. склалі толькі 47 %. Павялічыўся разрыў паміж узроўнем даходаў бедных і багатых. Паводле эканамічных паказчыкаў Расія набліжалася да найбяднейшых краін свету, што існавалі за кошт продажу прыродных рэсурсаў.

Палітыка Прэзідэнта РФ У. У. Пуціна ад пачатку новага тысячагоддзя прывяла да ажыўлення эканомікі.

За перыяд з 1999 да 2006 г. аб'ём ВУП вырас з 4823 млрд руб. да 26 781,1 млрд руб. Высокія цэны на нафту дазволілі Расіі назапасіць золатавалютныя рэзервы, паводле гэтага паказчыка краіна стала 3-й у свеце (пасля Кітая і Японіі). Дзяржава змагла выконваць сацыяльныя абавязацельствы, своечасова выплачваліся заробкі, былі павышаны пенсіі.

У сучаснай расійскай эканоміцы знаходзяць адлюстраванне найноўшыя трэнды і тэндэнцыі. Ствараюцца тэхнапаркі, у якіх канцэнтруюцца распрацоўкі



*Сімвалам маштабнага будаўніцтва зрабіўся Крымскі мост. Яго працягласць — 19 км. 2018 г.*

высокіх тэхналогій, вялікая ўвага надаецца развіццю нанатэхналогій. З улікам небяспекі залежнасці ад цэн на энерганосьбіты ў 2004 г. быў створаны Стабілізацыйны фонд (ад 2018 г. — Фонд нацыянальнага дабрабыту).

Нягледзячы на негатыўныя знешнія ўздзеянні, эканоміка Расіі на трэцяе дзесяцігоддзе XXI ст. дэманструе высокія тэмпы росту і велізарны патэнцыял устойлівасці.

**4. Расійская Федэрацыя на міжнароднай арэне.** Як правапераемніца СССР Расія захавала месца ў найбуйнейшых міжнародных арганізацыях, напрыклад у Савеце Бяспекі ААН.

**Новыя прыярытэты знешняй палітыкі**

Расійская Федэрацыя ад 1991 г. у якасці прыярытэтнай задачы знешняй палітыкі разглядала збліжэнне з краінамі Захаду і пераадоленне наступстваў «халоднай вайны». У працяг пачатага раней працэсу раззбраення ў 1993 г. Расія і ЗША заключылі новую Дамову аб абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў.

Пакажыце на карце краіны «Вялікай сямёркі». Якую ролю адыгрывае гэтая арганізацыя ў сучасным свеце?

Нягледзячы на перакананне лідараў краін Захаду ў тым, што СССР (а значыць, і Расія) пацярпеў паражэнне ў «халоднай вайне» і Расія не можа прэтэндаваць на адстойванне сваіх інтарэсаў, з яе статусам адной з вядучых сусветных дзяржаў вымушаны былі лічыцца. Так, дэлегацыю РФ пачалі запрашаць на штогадовыя нарады лідараў «Вялікай сямёркі» («G7»), якая ў выніку ператварылася ў «G8». У 1994 г. Расія далучылася да праграмы НАТА «Партнёрства ў імя міру», а ў 1996 г. увайшла ў Савет Еўропы.

**Нарастанне міжнароднай напружанасці**

Аднак адной добрай волі Расіі, яе жадання наладзіць добрасуседскія адносіны з краінамі Захаду аказалася недастаткова. Заходнія краіны надзвычай балюча ўспрымалі канкурэнцыю на сусветным рынку расійскіх тавараў і рэсурсаў. Падзеі ў Чачні зрабіліся падставай для абвінавачвання Расіі ў парушэнні правоў чалавека, у выніку быў прыпынены яе ўдзел у Савеце Еўропы.

У Расіі надзвычайнае абурэнне выклікалі дзеянні заходніх краін на чале з ЗША, такія як агрэсія НАТА супраць Сербіі ў 1999 г.; пашырэнне за кошт былых краін сацыялістычнага лагера і савецкіх рэспублік (у 2004 г. — Літвы, Латвіі і Эстоніі); выхад у 2002 г. ЗША ў аднабаковым парадку з Дамовы 1972 г. аб абмежаванні сістэм супрацьракетнай абароны (СРА). Усё гэта запатрабавала карэкціроўкі курсу знешняй палітыкі Расіі.

**Супрацоўніцтва з краінамі Азіі і Лацінскай Амерыкі**

Ад канца 1990-х гг., захоўваючы стабільныя адносіны з ЗША і іх саюзнікамі, Расія ў той жа час пачала больш увагі надаваць наладжванню супрацоўніцтва з такімі краінамі, як Кітай, Індыя, Іран, і традыцыйнымі саюзнікамі СССР — Кубай, Паўночнай Карэяй, В'етнамам і інш. Расія паслядоўна выступае за неабходнасць прызнання *шматпалярнасці свету*, настойваючы на раўнапраўі ўсіх дзяржаў.

У 2007 г. на Мюнхенскай канферэнцыі па пытаннях міжнароднай бяспекі У. У. Пуцін выступіў з прамовай, у якой заклікаў да ўсталявання новага сусветнага парадку, дзе няма месца аднапалярнасці. На думку сучасных палітолагаў, прамова прэзідэнта адзначыла паварот знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі, «пераход да адкрытай формы рэалізацыі расійскай знешнепалітычнай стратэгіі 21 ст.».

Нягледзячы на нязгоду з палітыкай ЗША ў Іраку, Расія ў маі 2003 г. ратыфікавала Дамову аб скарачэнні стратэгічных наступальных узбраенняў. У тым самым годзе пасля катастрофы амерыканскага шатла «Калумбія» Расія ўзяла на сябе забеспячэнне функцыянавання Міжнароднай касмічнай станцыі. Аднак ЗША і краіны Захаду па-ранейшаму бачылі ў Расіі палітычнага і эканамічнага канкурэнта, што было асабліва відавочна на фоне эканамічнага ўздыму, які ў ёй пачынаўся, і росту канкурэнтаздольнасці расійскай прадукцыі на сусветным рынку.



*МКС — шматмэтавы касмічны даследчы комплекс, уведзены ў эксплуатацыю ў 1998 г.*

Успомніце, што такое «каляровыя рэвалюцыі».

У новым тысячагоддзі ўсё больш відавочным робіцца імкненне ЗША і краін Захаду абмежаваць уплыў Расіі, нават шляхам прамога ўмяшання ва ўнутраную сітуацыю ў суседніх краінах. «Каляровыя рэвалюцыі», што адбыліся ў шэрагу краін з падтрымкай замежных фондаў, прывялі да ўлады ў іх сілы, варожыя Расіі.

### Супрацоўніцтва з краінамі СНД

Галоўным знешнепалітычным прыярытэтам Расіі выступае развіццё ўзаемаадносін з краінамі СНД, гэта вызначана ў Канцэпцыі знешняй палітыкі, зацверджанай Прэзідэнтам У. У. Пуціным у чэрвені 2000 г. У рамках рэалізацыі гэтага кірунку была падпісаная Дамова аб заснаванні Еўразійскай эканамічнай супольнасці, створаныя Мытны саюз і Арганізацыя Дамовы аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), падпісаная дамова аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС).

Падрыхтуйце прэзентацыю пра гэтыя міжнародныя арганізацыі, указаўшы дату стварэння, мэты, краіны, што ўдзельнічаюць.

Аднак ва ўзаемаадносінах Расіі з краінамі постсавецкай прасторы не ўсё складваецца спрыяльна. У міжнацыянальных канфліктах, што ўзнікалі ў суседніх краінах, Расія выступала ў ролі міратворца (Прыднястроўе, Абхазія, Таджыкістан, Паўднёвая Асеція, Карабах), прымала бежанцаў, што дадатковым цяжарам клалася на яе эканоміку. Але найбольш драматычны характар набылі расійска-ўкраінскія адносіны.

### Абвастрэнне адносін з Украінай

Абвастрэнне адносін паміж Расіяй і Украінай пачалося неўзабаве пасля распаду СССР і было звязана з транзітам расійскага газу ў еўрапейскія краіны і пастаўкамі энергарэсурсаў ва Украіну. «Аранжавая рэвалюцыя» 2004 г. прывяла да ўлады ва Украіне адкрыта празаходніх палітыкаў. Узаемныя прэтэнзіі Расіі і Украіны ўзмацніліся. На тэрыторыі апошняй пачалі расці русафобскія настроі: зносілі помнікі савецкім воінам-вызваліцелям, перайменоўвалі населеныя пункты, выцяснялі рускую мову. Усё гэта выклікала абурэнне рускамоўнага насельніцтва Украіны, асабліва шматлікага на ўсходзе краіны. Чарговы па-

літычны крызіс ва Украіне ў 2014 г. (еўрамайдан) прывёў да ўлады радыкальных нацыяналістаў, якія ўзялі курс на гвалтоўную ўкраінізацыю. У шэрагу рэгіёнаў і гарадоў, якія засталіся ў складзе Украіны пасля распаду СССР, — у Крыме, Данецку, Луганску, Адэсе, Харкаве — узніклі стыхійныя пратэсты, пазней названыя «Рускай вясной». Адным з яе вынікаў было ўваходжанне Рэспублікі Крым і г. Севастопаля ў склад Расійскай Федэрацыі.

У красавіку 2014 г. жыхары Данецкай і Луганскай абласцей Украіны адмовіліся падпарадкоўвацца Кіеву і абвясцілі стварэнне Данецкай і Луганскай Народных Рэспублік (ДНР і ЛНР). Украінскія ўлады паспрабавалі ўзброеным шляхам знішчыць рэспублікі, якія імкнуліся да незалежнасці. Умовы заключанага ў лютым 2015 г. у Мінску пагаднення аб спыненні агню не выконваліся. Карыстаючыся падтрымкай НАТА, украінскія ўлады ўзмацнялі ваенны ціск на ДНР і ЛНР, якія падтрымлівала Расія. 21 лютага 2022 г. Расія прызнала незалежнасць дзвюх рэспублік (ДНР і ЛНР), а 24 лютага пачала ажыццяўленне Спецыяльнай ваеннай аперацыі (СВА)




*На праведзеным у сакавіку 2014 г. рэферэндуме 97 % крымчан падтрымалі далучэнне Рэспублікі Крым да Расійскай Федэрацыі*



*Г. Мінск, люты 2015 г.*

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, што такое Мінскія пагадненні. Дайце ацэнку міратворчай дзейнасці Рэспублікі Беларусь у спробе ўрэгулявання канфлікту.

Успомніце, што такое дэнацыфікацыя і дэмілітарызацыя. У адносінах да якой краіны праводзілася такая палітыка ў XX ст.?

ва Украіне. Яе мэтамі абвешчаны абарона насельніцтва ДНР і ЛНР, дэнацыфікацыя і дэмілітарызацыя Украіны.

30 верасня 2022 г. Прэзідэнт У. У. Пуцін падпісаў дамовы аб уваходжанні ў склад Расіі на правах суб'ектаў Федэрацыі Данецкай Народнай Рэспублікі, Луганскай Народнай Рэспублікі, Запарожскай і Херсонскай абласцей. Але ваеннае супрацьстаянне Расіі і Украіны працягнулася, бо дзяржавы Захаду свядома сарвалі дыпламатычнае вырашэнне канфлікту, абнуліўшы міратворчыя намаганні Расіі, Беларусі, краін «глабальнага Поўдня» і іншых суб'ектаў, зацікаўленых у міры ва Украіне.

*За гады, якія прайшлі пасля распаду СССР, Расійская Федэрацыя сутыкнулася з мноствам выклікаў ва ўнутрыпалітычнай і знешнепалітычнай сітуацыях, узаемаадносінах цэнтра і рэгіёнаў, з эканамічнымі і сацыяльнымі трансфармацыямі. Годны адказ на іх дазваляе бачыць у Расіі ўнікальную дзяржаву, якая валодае магутным патэнцыялам.*

**калі ў свеце…**

12 снежня 1993 г. — прыняцце новай Канстытуцыі Расійскай Федэрацыі, у якой значна пашырыліся паўнамоцтвы Прэзідэнта РФ

**у Беларусі…**

24 лістапада 1996 г. — правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму, на якім беларускі народ падтрымаў праект змен у Канстытуцыю, прапанаваны Прэзідэнтам А. Р. Лукашэнкам

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Складзіце гекс (ментальную карту, схему) «Прычыны і наступствы распаду СССР».
2. Вызначце асноўныя этапы дзяржаўна-палітычнага развіцця Расійскай Федэрацыі пасля распаду СССР. Дайце кароткую характарыстыку кожнага з іх.
3. З якімі выклікамі сутыкнулася Расійская Федэрацыя ў галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця за апошнія 30 гадоў? Як вырашаліся праблемы, што ўзнікалі? Назавіце асноўныя дасягненні Расіі ў сацыяльна-эканамічнай сферы.
4. Апішыце асноўныя кірункі знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі ў канцы 1990-х — пачатку 2000-х гг. Дайце ацэнку ролі Расійскай Федэрацыі ў сучаснай сусветнай супольнасці.
5. Як вы лічыце, чым абумоўлена палітыка Расіі ва ўмовах новых выклікаў сучаснага грамадства?